ЛІТАРАТУРА:
1. Рагойша, В. Верш. Паэзія: энцыклапедычны даведнік / В. Рагойша. – Мінск, 2020. – 472 с.
2. Адамовіч, І. Паэзія Ніла Гілевіча: жанрава-стылёвая адметнасць / І. Адамовіч // Мова – літаратура – культура : матэрыялы IX Міжнар. навук. канф. памяці праф. А. Я. Міхневіча, Мінск, 15–16 кастр. 2020 г. / Беларус. дзярж. ун-т ; рэдкал.: А. А. Радзевіч (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : БДУ, 2020. – С. 202–207.

# ФАРМІРАВАННЕ КУЛЬТУРЫ ЧЫТАННЯ МАЛОДШЫХ ШКОЛЬНІКАЎ НА АСНОВЕ НАЦЫЯНАЛЬНЫХ КУЛЬТУРНЫХ ТРАДЫЦЫЙ

**Чурык Л. С.**

Гродзенскі дзяржаўны універсітэт імя Янкі Купалы
Навуковы кіраўнік – к. філал. н., дацэнт Лапкоўская А. М.

Рэпазіторый ГрГМУ

У сучасным жыцці чытацкая дзейнасць з’яўляецца адной з важных форм сацыялізацыі асобы, далучэнне яе да нацыянальных культурных традыцый і сацыяльнага вопыту чалавецтва. Чытанне садзейнічае развіццю памяці, мыслення, фарміруе індывідуальную сістэму каштоўнасцей, умацоўвае стрыжань асобы, выпрацоўвае эстэтычныя адносіны да рэчаіснасці, а таксама з’яўляецца адным са сродкаў узбагачэння слоўнікавага запасу вучняў, развіцця іх звязнага маўлення і пісьменасці. Адна з галоўных мэт настаўніка – навучыць чытаць, думаць, разумець, працаваць з тэкстам, цаніць літаратуру.

Метадалагічнай асновай навучання літаратурнаму чытанню з’яўляецца культаралагічны падыход. Асноўная асветніцкая функцыя – гэта знаёмства вучняў з самабытнай беларускай народнай і аўтарскай літаратурай, традыцыямі, з’явамі матэрыяльнай і нематэрыяльнай культуры, сучаснай беларускай дзіцячай літаратуры як элементам культуры. У працэсе навучання адбываецца разумовае і эмацыянальнае пранікненне ў сутнасць нацыянальных культур, адметнасцей беларускай літаратуры [1]. У кантэксце культуралагічнага падыходу стымулюецца пазнавальная актыўнасць вучняў у спасціжэнні гістарычных, навукова-папулярных, вобразна-мастацкіх звестак пра Беларусь, яе прыроду, гісторыю, традыцыі, побыт, міфалогію і г.д.

Для фарміравання традыцый вельмі важна даваць школьнікам пачатковае веданне пра народ, звычаі, гісторыю, культуру. Гэтыя каштоўнасці рэалізуюцца шляхам азнаямлення дзяцей з нацыянальнымі народнымі святамі, з іх абрадамі, традыцыямі, песнямі, гульнямі. Задача настаўніка–раскрыць духоўны і маральны патэнцыял народнай культуры і давесці яго да дзіцяці ў даступнай форме. Таксама вялікае значэнне надаецца павелічэнню слоўнікавага запасу дзяцей шляхам сэнсавага тлумачэння незнаёмых слоў, іх

паходжання(этымалогіі) і гістарычнага значэння. Неабходна паэтапнае ўвядзенне дзяцей у вобразны свет народнай каляндарнай абраднасці. У першую чаргу даць дзецям уяўленне пра сувязь народнага календара з гадавым колам земляробчых работ; растлумачыць сэнс абрадавых гульняў; пазнаёміць з паэтычнымі ўвасабленнямі прыроды ў народнай фантазіі. Затым варта пазнаёміць з праваслаўным календаром, хрысціянскімі сюжэтамі, асноўнымі святамі праваслаўнай царквы, іх духоўным сэнсам.

На I ступені агульнай сярэдняй адукацыі часцей за усё для фарміравання культурных традыцый выкарыстоўваюцца малыя формы фальклору: песні, прыказкі, казкі, пацешкі, лічылкі, і г.д. Самыя распаўсюджаныя метады фарміравання культуры чытання вучняў малодшага школьнага ўзросту з выкарыстаннем малых форм фальклору наступныя: чытанне настаўнікам, завучванне на памяць, інсцэніроўка і маляванне эпізодаў, падбор літаратурнага твора (твора жывапісу), разгляд кнігі і малюнкаў, гутарка, слоўныя гульні*(«Адгадай, хто я», «Дакажы больш цікава»* і інш.). Прыказкі і скорагаворкі выкарыстоўваюцца на розных этапах урока: можна разабраць у пачатку ўрока на этапе моўнай размінкі, можна звярнуць на іх увагу напрыканцы ўрока ў час замацавання матэрыялу па тэме. Фарміраванне культуры чытання малодшых школьнікаў адбываецца пры знаёмстве з вуснай народнай творчасцю на ўроках літаратурнага чытання пры выкананні наступных практыкаванняў і гульняў: *прачытац ьпрыказкі або скорагаворкі павольна, самастойна, старанна вымаўляючы кожны гук:* У бабулі быў баран, бойка біў ен у барабан; *прачытаць прыказкі або скорагаворкі павольна хорам*: Хто працуе, той і мае; *прачытаць прыказкі хутка*: Ніякая праца, не гамбіць чалавека; *прачытаць прыказкі адзін аднаму*: Бацькоў слухаць, гора не знаць; *прачытаць прыказкі на памяць*: Ваўка баяцца, у лес не хадзіць; *прагаворванне ў розным тэмпе з розным інтанацыйным падтэкстам* (радасна, захоплена, сумна, усхвалявана, здзіўлена, заклапочана, расчаравана); *прагаворванне, якое суправаджаецца пэўнымі прапанаванымі дзеяннямі* (напрыклад, воплескамі, ўзмахамі рукі, танцавальнымі рухамі): Гуляй, гуляй, ды справы не кідай; *гульня «Працягні пачатае».* У гульні выкарыстоўваецца мяч. Вядучы гаворыць пачатак прыказкі і кідае мяч аднаму з гульцоў, які павінен дагаварыць канец прыказкі і вярнуць мяч вядучаму. Гулец, які пратрымаўся даўжэй за ўсіх, становіцца пераможцам і атрымлівае бал для адзнакі за ўрок); *гульня «Стужка прыказак».* Для гульні патрабуецца доўгая стужка, канцы якой замацаваны на дзвюх палачках. Два вучні па сігналу настаўніка пачынаюць змотваць стужку і гаварыць прыказкі адначасова. Перамагае той з удзельнікаў, які змог зматаць большы кавалак стужкі і пры гэтым не збіўся ў прыказках; *гульня «Збяры прыказку»:* Слухаў, не, і, вялікі, малы, паслухае, не; *злучы пачатак і канец прыказак*: Хто без навукі,… той як бязрукі.

Такім чынам, з дапамогай розных формаў фальклору можна вырашаць практычна ўсе задачы развіцця вучняў пачатковых класаў. Нароўні з асноўнымі метадамі і прыёмамі развіцця малодшых школьнікаў можна і трэба выкарыстоўваць гэты найбагацейшы матэрыял вуснай творчасці народа. Уключэнне фальклорнага матэрыялу ў навучальны працэс малодшых

школьнікаў дазваляе фарміраваць асновы сістэматычных ведаў; развіваць асаблівасці іх характару, волі, маральнага аблічча. Правільна выкарыстоўваючы розныя метады выхавання, у тым ліку запазычаныя ў народнай педагогіцы, мы можам сфарміраваць эстэтычна і маральна пісьменную і выхаваную асобу.

ЛІТАРАТУРА:

1. Вучэбная праграма па вучэбным прадмеце «Беларуская літаратура (літаратурнае чытанне)» для IV класаў станоў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання і выхавання // Нацыянальны адукацыйны партал [Электронныррэсурс]. – Рэжым доступу : http://surl.li/djdrm – Дата доступу: 14.10.2022.

Репозиторий ГрГМУ